Пачуццё патрыятызму выхоўваецца з маленства. У Год гістарычнай памяці асабліва хочацца данесці і перадаць нашчадкам памяць аб продках, іх традыцыях, славе роднага краю. Наш край заўсёды славіўся і славіцца людзьмі і іх справамі на карысць Радзіме, Бацькаўшчыне. Мы ганарымся землякамі-патрыётамі, іх ведаюць далёка за межамі раёна (браты Лычы, М. Пармон, Л. Цыбульская, Х. Шкляр).

# З Нёманскіх вытокаў

## Грамадзянска-патрыятычнае выхаванне вучняў на ўроках беларускай мовы і літаратуры і ў пазакласнай дзейнасці



**Любоў Анатольеўна Собаль,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі ДУА «Нёманская сярэдняя школа імя І. Д. Гурскага» Уздзенскага раёна. Педагагічны стаж — 42 гады

Патрыятычнае выхаванне — актуальны кірунак у рабоце настаўніка, які адпавядае сацыяльнаму заказу грамадства. Яно вырашае шэраг задач: 1) фарміраванне актыўнай грамадзянскай пазіцыі; 2) фарміраванне каштоўнасных адносін да Радзімы, выхаванне на найлепшых традыцыях нацыянальнай культуры; 3) выхаванне павагі да нацыянальнай спадчыны, гісторыі роднага краю; 4) стварэнне ўмоў для развіцця творчай асобы.

Вялікая роля ў выхаванні грамадзянскасці і патрыятызму належыць сям'і. Маральныя нормы грамадства паўстаюць перад дзецьмі ў формах патрабаванняў бацькоў. У школе ўрокі мовы і літаратуры, гісторыі, грамадазнаўства, геаграфіі ў большай ступені выхоўваюць высокія патрыятычныя пачуцці. Урокам літаратуры, роднаму слову належыць асноўная роля ў фарміраванні нацыянальнага светапогляду, грамадзянскасці і патрыятызму, духоўным станаўленні маладых людзей і фарміраванні высокамаральнай асобы.

Патрыятызм — адна з галоўных тэм у літаратуры і мастацтве. Вывучаючы творы класікаў Я. Купалы, Я. Коласа, М.Танка, П. Панчанкі, А. Куляшова, Я. Янішчыц, Р. Барадуліна, В. Быкава, У. Караткевіча, І. Шамякіна, сучасных беларускіх пісьменнікаў М. Башлакова, Я Сіпакова, В. Шніпа, Г. Марчука, А. Дударава, вучні далучаюцца да найбагацейшай скарбніцы духоўнасці і гуманізму. Вобраз Радзімы — адзін з галоўных і сэнсаўтваральных у літаратуры. Радзіма, Айчына, Бацькаўшчына — у кожным творы беларускіх пісьменнікаў. На ўроках вучні атрымліваюць неабходныя веды, вывучаюць жыццё і творчасць беларускіх пісьменнікаў, а пазакласная праца дапамагае зацікавіць у паглыбленым вывучэнні літаратуры, заахвочвае вучняў да творчасці. Мы прыкладаем намаганні, каб вучні вясковай школы мелі магчымасць сустрэцца са

ЧИТАЙТЕ В СВЕЖЕМ НОМЕРЕ «ОМ»